Грунтуючыся на гэтай гісторыі кахання і пабудавана найпрыгажэйшая легенда пра Чорную даму Нясвіжа. Кароль пасля смерці жонкі так пакутаваў, што вырашыў шукаць дапамогі ў алхімікаў, паспрабаваць выклікаць яе душу. У змрочнай зале Жыгімонт даў слова, што будзе сядзець спакойна і толькі на адлегласці запытаецца ў каханай, як яму жыць далей. Але калі з'явілася здань, кароль кінуўся да прывіда і хацеў яго абняць. Пачуўся выбух і па пакою папоўз трупны пах.

Цяпер душа Барбары не змагла знайсці дарогу назад і ёй наканавана блукаць па зямлі. Яна пасялілася ў Нясвіжскім замку. З таго часу перад жывымі яна з'яўляецца ў чорным адзенні ў знак жалобы па сваім загубленым каханні.


Спіс выкарыстаных крыніц

1 Шышыгіна-Патоцкая, К.Я. Чорная дама Нясвіжскага замка. – Мінск, 1992 – С. 43 – 44.

2. Чаропка В. Каралева кахання Барбара Радзівіл / В. Чаропка // Беларускі гістарычны часопіс. – Мінск, 2002. – № 6. – С. 63.

3 Рудзкі Э. Барбара Радзівілянка — другая жонка Жыгімонта Аўгуста: пер. з польск. / Э. Рудзкі // Спадчына. – Мінск, 1994. – №9. – С. 20 - 25.


УДК 821. 16 13

## ВОБРАЗ РАДЗІМЫ Ў ТВОРЧАСЦІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА


*Студэнт – Бандарчык А.А., 33 тс, 1 курс ФТС*

*Навуковы кіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*

*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*


Сучасная беларуская паэзія нараджаецца з жыцця і адлюстроўвае яго ва ўсёй складанасці і супярэчлівасці. Яна вучыць высокай праўдзе і чалавечнасці, раскрывае ўнутраны свет чалавека, падымае душу народа над будзённа-павярхоўным і дробязным [1, с. 192].

Тэматыка сучаснай паэзіі надзвычай разнастайная: Радзіма, бацькоўскі дом, родная мова, гістрычнае мінулае, прырода, экалогія, чарнобальская трагедыя, праца, каханне і інш. [2, с. 89].

Патрыятычныя матывы – самыя распаўсюджаныя ў паэзіі. Пісаць пра Радзіму няпроста, цяжка быць арыгінальным у гэтай

тэме. Аднак яна не страчвае сваёй актуальнасці, бо нельга сапраўднаму творцу адвярнуцца ад праблем часу і адарвацца ад сваіх каранёў.

Рыгор Барадулін – паэт шматгранны і нават у некаторай ступені непрадказальны. Для творчасці паэта характэрна разнастайнасць жанраў, вобразна-стылявых сродкаў, яркая метафарычнасць, тонкі псіхалагізм, багацце моўнай палітры. Мова твораў Р. Барадуліна надзвычай багатая і арыгінальная. Яна гучыць і ўспрымаюцца ў арганічным адзінстве з народнай стыхіяй [3, с. 45 – 48].

Тэма Радзімы і Бацькаўшчыны – галоўнае ў творчасці Р. Барадуліна. Яна праходзіць праз усе яго зборнікі. Нямала радкоў прысвяціў паэт матчынай хаце, роднай вёсцы, таму кутку, дзе былі зроблены першыя крокі па зямлі (вершы «Мая Бацькаўшчына», «Заінелая Ушаччына», «Зямля бацькоў», «Прыцягненне Віцебскай зямлі»).

Многія з нас памятаюць вершаваныя радкі Р. Барадуліна аб вернасці бацькоўскаму дому, якія робяць чалавека лепшым, дабрэйшым, духоўна багацейшым:

*Трэба дома*
*бываць часцей,*
*Трэба дома*
*бываць не госцем,*
*Каб душою*
*не ачарствець,*
*Каб не страціць*
*святое штосьці* [4, с. 377].

Родная зямля паўстае ў вершах Р. Барадуліна ва ўсёй сваёй непаўторнай красе, і паэт адкрыта прызнаецца:

*Я шчасны,*
*што сынам быць*
*гэтай зямлі*
*Мне лёсам наканавана* [4, с. 377].

Вобраз Радзімы для паэта, як вобраз маці, самы дарагі і святы. Прадстаўленыя паэтычныя радкі хвалююць сваёй натуральнасцю перажывання.

Такім чынам, творы Р. Барадуліна, прысвечаныя Бацькаўшчыне, вучаць высокай праўдзе, справядлівасці, дабру і чалавечнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Старычонак В.Д. Беларуская літаратура: дапам. для абітурыентаў. – 3-е выд. – Мінск, 1995. – С. 192.

2. Верціхоўская М.І. Беларуская літаратура: білеты ў пытаннях і адказах. – 2-е выд. – Мінск, 2002. – С. 89

3. Мантур, А.Я. Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы Рыгора Барадуліна і іх рускія эквіваленты / А.Я. Мантур // Роднае слова. – 2015. – №7. – С. 45 – 48.

4. Бородулин Р.И. Опрокинутое = Перакуленае. – Москва, 2010 512 с.

УДК 159.925

## МОВА ЖЭСТАЎ

*Студэнты – Гаўрылюк Я.Я., 33 тс, 1 курс ФТС;*
*Максімовіч С.І., 2 мпт, 1 курс АМФ*
*Навуковыкіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Мова – найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі. Дзеля таго каб існаваць, людзі павінны дамовіцца паміж сабою пра супольныя справы, размеркаванне абавязкаў, пра вызначэнне агульных планаў і г.д. Ажыццяўленне падобнага тыпу патрэб і дасягаецца пры дапамозе мовы [1, с. 5]. Сукупнасць дапаможных сродкаў зносін таксма называюць “мовай”. У паўсядзённым жыцці мы таксма карыстаемся мовай жэстаў, мовай мімікі, мовай рухаў [2, с. 9].

Аўстралійскі спецыяліст А. Піз сцвярджае, што пры дапамозе слоў перадаецца 7 % інфармацыі, гукавых сродкаў – 38 %, мімікі, жэстаў, паставы – 55 % [3, с. 15 – 22].

Большасць даследчыкаў падзяляюць меркаванне, што слоўны (вербальны) канал выкарыстоўваецца для перадачы інфармацыі, у той час як невербальны канал ужываецца для “абмеркавання” міжасобасных зносін, а ў некаторых выпадках выкарыстоўваецца замест слоўных паведамленняў. Напрыклад, жанчына можа выразна перадаць сваё стаўленне мужчыне праз погляд, нічога пры гэтым не сказаўшы.

Ахарактарызуем асноўныя тыпы сігналаў цела:

1. **Пастава.** Пад паставай мы разумеем не толькі становішча, якое прымае чалавек, але і рухі, якія змяняюць гэтае становішча або ўплываюць на яго, як, напрыклад, перамяшчэнне цэнтра цяжару пры калыханні наперад-назад, з наска на пятку, змена нагі і т.п.